Д. А. Клім, Ю. Д. Шыла

# СПРОБА АДНАЎЛЕННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА НАПАЛЕОНАМ БАНАПАРТАМ

*У дакладзе разглядаецца перыяд гісторыі Беларусі часоў Напалеонаўскіх войнаў. Жаданне беларусаў адрадзіць Вялікае Княства Літоўскае прывяло да падтрымкі Напалеона, спадзяваючыся, што менавіта ён зможа дапамагчы адрадзіць незалежную дзяржаву. Падрабязна былі апісаны наступствы Айчыннай вайны сярод французаў і рускіх на тэрыторыі Беларусі. А таксама тое, што вялікія спадзяванні беларусаў на адраджэнне ВКЛ прывяло да няўдачы.*

Пачатак новага 19 стагоддзя Еўропа сустрэла ў дыме вайсковых гармат. Захапіўшы ўладу ў Францыі, Напалеон пачаў відавочна праяўляць свае прэтэнзіі на панаванне ў Еўропе.

Расія вымушана была заключыць з Францыяй у 1807 г. Тыльзіцкі мір. Згодна з гэтым дагаворам, Напалеон стварыў з польскіх зямель, што належалі Прусіі, Герцагства Варшаўскае, васальную Францыі дзяржаву на мяжы з Расіяй. Гэта парадзіла спадзяванні сярод шляхты былога ВКЛ на тое, што Напалеон верне незалежнасць гэтай дзяржавы, вызваліўшы ад Расійскай імперыі. За некалькі гадоў да 1812 г. палкоўнік Тадэвуш Тышкевіч пісаў у рапарце Напалеону, што "ў краіне ад Нёмана да Дзвіны ў людзей адкрытыя сэрцы для Напалеона".

16 чэрвеня 1812 г. французскае войска ўвайшло ў Вільню, былую сталіцу ВКЛ. 1 ліпеня 1812 г. Напалеон аб’явіў аб стварэнні Часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага ў Вільні – Камісіі Вялікага Княства Літоўскага. У новае ВКЛ увайшлі землі Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў Расійскай імперыі, а таксама Беластоцкая вобласць. Гэтыя губерні былі пераўтвораны ў дэпартаменты, а іх адміністрацыя складалася як з французаў, так і з мясцовага насельніцтва.

Другім па значнасці горадам нашых земляў быў Мінск. Тут было праведзена ўрачыстае богаслужэнне ў касцёле з блаславеннем поспехаў французскай арміі. Генерал Даву ў сваёй урачыстай прамове сказаў, што яны прыйшлі не прыгнятаць мясцовае насельніцтва, а вярнуць яму Радзіму.

Такім чынам, Напалеон даў многім жыхарам беларускіх земляў тое, чаго яны жадалі больш за ўсё на свеце. Такую палітыку імператар праводзіў не без выгады для сябе – польская і беларуская шляхта добраахвотна запісвалася ў шэрагі Вялікай арміі.

Пытанне аб палітычнай будучыні ВКЛ заставалася нявырашаным. Палякі заклікалі аднавіць Рэч Паспалітую ў старых межах. Аднак Напалеон не спяшаўся з адказам, ён спадзяваўся на заключэнне міру з Аляксандрам I і не жадаў лішняй перашкоды. Да таго ж літоўска-беларуская шляхта марыла аб стварэнні самастойнай дзяржавы і не жадала аб’яднання з Польшчай. Менавіта таму Напалеон і не далучаў тэрыторыю ВКЛ да Герцагства Варшаўскага і ігнараваў просьбы польскага сейма.

Напалеон разглядаў Мінск у якасці своеасаблівага тылу для сваёй Вялікай арміі. Горад ён планаваў ператварыць у склад неабходнага правіянту і амуніцыі, а таксама пункт для хворых і параненых салдат і афіцэраў. Тут ён збіраўся перачакаць зіму 1813 г.

15 жніўня 1812 г. Мінск урачыста святкаваў дзень нараджэння Напалеона. Была праведзена служба і малебен за здароўе і доўгія гады імператара.

У гэты час сам Напалеон вёў вайну на палях Расіі. 14 верасня ён без бою ўзяў пакінутую расійскімі войскамі Маскву. Аднак сілы яго салдат былі на зыходзе, набліжалася зіма, а зімаваць у спаленым і спустошаным горадзе не ўяўлялася магчымым. Напалеон спяшаўся ў Мінск, дзе яго войска чакалі зімовыя кватэры, вялікія запасы правіянту і адзення.

У лістападзе 1812 г. каля в. Студзёнка непадалёку ад Барысава французам быў нанесены завяршальны ўдар. Чычагоў апярэдзіў Напалеона, і 16 лістапада руская армія заняла Мінск. Пасля ўступлення расійскай арміі ў Менск, адразу быў скасаваны літвінафранцузскі ўрад. У горадзе было ўведзена ваеннае становішча і прызначаны ваенны губернатар. Горад знаходзіўся ў стане спусташэння.

Нягледзячы на ваенныя бедствы, беларускія губерніі не былі вызвалены ад рэкруцкіх набораў, засталося і прыгоннае права. У той жа час мясцовая шляхта, нават скампраметаваная супрацоўніцтвам з Напалеонам, у большасці захавала свае правы і прывілеі. Такім чынам, вялікія надзеі на аднаўленне незалежнсці ВКЛ з дапамогай іншаземцаў апынуліся няўдачай.

### *Список литературы*

1. Большие надежды. Как беларусы пытались возродить ВКЛ в 1812 году [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https: //1863x.com/vkl-1812/. – Дата доступа: 23 августа 2017.
2. 24 июня. Начало войны с Наполеоном [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://planetabelarus.by/publications/24-iyunya-nachalo-voyny-s-napoleonom/. – Дата доступа: 24.06.2025.
3. Гісторыя Беларусі ў 6 т. Том 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск, 2004.

*Клим Дарья Александровна*, студэнтка 1 курса ФИТУ БГУИР
*Шило Юлия Дмитриевна*, студэнтка 1 курса ФИТУ БГУИР
*Научный руководитель: Янковский Ю. Ю.*, преподаватель